*Н. М. Борсук (Брэст)*

# ЧАЛАВЕК – ЧАС – ПРАСТОРА Ў ПАЭТЫЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ АЛЕСЯ ПАПЛАЎСКАГА

2013 год для Алеся Паплаўскага стаў багатым на юбілейныя даты: 55 гадоў споўнілася з дня нараджэння, 35 – першаму вершу паэта «Рыжечубой тоской», убачыла свет трэцяя паэтычная кніга беларускага мастака слова «Скрыжалі душы».

Самабытнае паэтычнае слова Алеся Паплаўскага па-ранейшаму кранае душы чытачоў: *«Світальнаю прыгажосцю / Душы слепату змываю...»* (верш «Пакорлівасцю атрутнай»), *«І немата з тваёй далоні / Няўпросых п'е маю самоту»* (верш «Нікчэмнасць слоў»); *«Там і не жыць без цябе мне. / Жыць... / Хочацца жыць»* (верш «Ноч... Стылы воск, цішыні хмель...»)... Паэтычная кніга «Скрыжалі душы» не разлічана на пасіўнага, безаблічнага, бяздумнага чытача. Дапытлівы чытач ад напісанага нашым земляком не толькі атрымлівае эстэтычную асалоду, але і спрабуе ў паэтычных радках зборніка «Скрыжалі душы» спасцігнуць таямніцы чалавечай душы, знайсці адказы на хвалюючыя пытанні: *«Прайшла сузіранняў хлуслівасць. / Калі?»* (верш «У шэрасці шэрасць не мрояць»), *«Двурушнасць: чужы пагляд, / Пыхлівасць і міг памкненняў?»* (верш «У садзе сумлення»), *«Душа пазнання – гулкасць крокаў?..»* (верш «Далакоп»), *«Адсутнасць сэнсу – сэнс жыцця?»...*

Паэтычная творчасць стала для Алеся Папалаўскага, як сведчаць і яго папярэднія зборнікі «Спынены лістапад» (1997), «Незваротнасць» (2002), нечым накшталт «мастацка-сацыяльнага доследу прычын пераадолення трагедыі чалавечай адасобленасці і адзіноцтва» (паводле Р. Бярозкіна). Як

тут не пагадзіцца з А. Каско, рэдактарам вышэй пералічаных паэтычных зборнікаў, што нават калі паэзія выяўляе трагізм і горыч, яна неабходна чалавеку як адна з іпастасяў красы: *«Неспатольнае спатоліць / Прыгажосць»* (верш «Невымернасці гадзіннік»).

На наш погляд, каб зразумець сутнасць Алеся Паплаўскага як асобы, сутнасць яго лірычнага героя, неабходна перачытаць першы зборнік паэта «Спынены лістапад». Алесь – нейкае дзіўнае спалучэнне хаосу і гармоніі, буры эмоцый і мудрай раўнавагі, аптымізму і незадаволенасці жыццём, якая апошнім часам усё часцей праяўляецца ў бурклівых заўвагах. Да гонару пісьменніка неабходна дадаць наступнае. На пытанне: «Алесь, што хочацца закрэсліць з ужо напісанага, што – забыць?» – ёнз пачуццём уласнай годнасці шчыра адказаў: «Нічога з напісанага не выклікае сум, сорам, прыкрае адчуванне; нічога не хочацца забыць, бо гэта частка мяне, жыцця». Ці не па гэтай прычыне паэт любіць дарыць добрым людзям свае кнігі? Аднойчы, падчас прэзентацыі першага паэтычнага зборніка, аказаўся настолькі шчодрым, што сам застаўся без экзэмпляраў. Пагадзіцеся, прыемна было Алесю атрымаць у якасці падарунка з рук Лявона Валасюка падчас адной з творчых сустрэч сваю кнігу «Спынены лістапад».

Лірычны герой А. Паплаўскага – чалавек не абыякавы. Ён здольны супакоіць бяздомнае хлапчаня (верш «Ля кавярні»), падтрымаць абяздоленага старца (верш «Абязлюднее храм. Змоўкне шумны натоўп»).

Герой А. Паплаўскага не сузіральнік – гэта актыўная, дзейная асоба. Ён не адасабляецца ад лёсу сваіх суайчыннікаў: *«З'яднаныя лёсам. Няма на каго наракаць»,* хаця крыўдна і балюча

*... і з году ў год*
*Чужыною радзімы дыхаць.*
*Тварам тыцкаюць на ўваход,*
*А шукаем уласны выхад.*
(І хвіліна, і цэлы год).

Лірычны герой марыць аб гарманічных узаемаадносінах у свеце людства. Туга па страчанай гармоніі дапамагае яму не столькі заўважыць, як адчуць недасканаласць свету, безабароннасць чалавека ў грамадстве. Гэта, безумоўна, узмацняе драматызм вершаў. Невыпадкова ў зборніку дамінуе матыў увядання жыцця, адзіноты, скрухі: шэрасць няспраўджаных дзён; адзінота шэрых дзён; месяц, нібыта плаха; рванай накідкай шэрай / Восень спаўзе на плечы; змучаная ноч; стомлены ранак; ля пад'езда воўчым крокам / Ціха ходзіць надвячорак; туга злачынная...

Шкада, што лірычны герой А. Паплаўскага не здольны вырвацца з палону супярэчнасцей, ён знаходзіцца ў духоўным разладзе нават з самім сабой, імкнецца нікому не паказваць сваёй слабасці, разгубленасці. Гэта моцная натура: *«Сляпцы... / Нашто шукаць спагаду / У тых, хто просіць сам яе?»* (верш «Цяжэй набыць, лягчэй растраціць»). Адзіны чалавек,

да якога стомлены, расчараваны ён ідзе на споведзь, – гэта матуля, а дакладней – светлая, удзячная памяць пра яе, бо маці паэта памёрла. Матуля, на думку паэта, – адзіная, хто здольны яго зразумець (*«дні мае – твае трывогі»*), падтрымаць, не аддаць на пакуты. Матуля хвалюецца, каб не стаў яе сын чужынцам на сваёй зямлі:

*Кажуць, зноў вясною гэтай*
*Не цвіла мая каліна.*
*Мама, ты не вер прыкметам,*
*Я не стаў чужынцам-сынам.*
*Я сябе яшчэ не страціў*
*За будзённай мітуснёю,*
*Адчыні мне дзверы, маці,*
*Я даўно не быў з табою.*
(Кажуць, зноў вясною гэтай)

У традыцыйнай мадэлі сусвету каліна звязана з ніжнім светам, светам памерлых. Уводзячы гэты вобраз у верш, А. Паплаўскі падкрэслівае, што няўлоўная, на першы погляд, сувязь яго героя з матуляю захоўваецца і пасля яе смерці.

Паступова праз боль, праз няспраўджанасць многіх жаданняў і мар лірычны герой А. Паплаўскага прыходзіць да ўспрымання жыцця ва ўсёй разнастайнасці яго праяўленняў:

*І толькі там, за мітуснёю,*
*Дзе нават боль – як паратунак,*
*Вучуся быць самім сабою*
*У недасяжных чыстых думах.*
*(За днямі дні...)*

Годна вырашаць праблему выбару на шляху пошуку духоўнага суладдзя лірычнаму герою нашага земляка дапамагае вера, што дасталася яму ў спадчыну ад прадзедаў: *«Веру я – значыць я жыву / на адвечнай зямлі пакутаў».* Гэтыя радкі з верша «Адзінотаю згрызены дзень» і паслужылі назваю для першай рэцэнзіі на першую паэтычную кнігу паэта [1, с. 3].

Пройдзе час, і ў аповесці «Піраміды» празаік А. Паплаўскі зробіць спробу ўдакладніць сваю пазіцыю: «Я не з тых людзей, якія здаюцца без бою... Мы павінны перажыць гэтае падзенне. Перажыць, паўтараюся, а не пераступіць праз яго. Бо калі праз усё і праз усіх пераступаць, можна незаўважана пераступіць праз сваё жыццё» [3, с. 219].

На наш погляд, назва зборніка «Спынены лістапад» адпавядае духоўным пошукам героя. «Восень, – адзначае літаратуразнаўца А. Хатэнка, – мае сваю мелодыку. Яна не просіць літасці і спагады, як вясна дзеля завязі,небунтуе цягай зачыну, як лета, не песціць надзею на абуджэнне, як зіма. Восень рахункуе. Яна мудра і прасветлена бачыць, хто чаговарты» [4, с. 70].

Як сведчыць другі зборнік паэта «Незваротнасць», Алесь Паплаўскі сцвердзіў сябе як паэт дапытлівага філасофскага складу. Ён па-ранейшаму ўсведамляе драматычную нестабільнасць свету, космасу, раз'яднанасць пачуццяў, думак, цела, душы: «*Дзе радасць, там поруч – здрада. / Дзе ўпэўненасць, там – ваганні*» (верш «Убогасць пустых палацаў»). Але ж у адрозненні ад сябе ранейшага, аўтара зборніка «Спынены лістапад», ён навучыўся даражыць кожнай пражытай хвілінай:

*Страчваць альбо мець –*
*Крайнасці быцця.*
*Не акупіць смерць*
*Мудрасці жыцця.*
*(На сямі вятрах)*

А. Паплаўскі бярэцца за ручку і чысты ліст паперы толькі ў тым выпадку, калі яму ёсць што сказаць новага, бо, як сцвярджае паэт, «невядомасць – вынік», а «існасць – небыццё» (верш «Альпіністы»). Алесь быў узрушаны, калі ў 2003 годзе яго прынялі ў Саюз беларускіх пісьменнікаў па рэкамендацыі такіх знакамітых літаратуразнаўцаў як У. Гніламёдаў, А. Лойка, А. Пашкевіч.

Для Алеся Паплаўскага творчасць – гэта магчымасць уласнай самарэалізацыі:

*Ні наперад, ні ўбок, ні назад...*
*І пастукаеш – не адчыняць.*
*І пяро як магчымасць сказаць.*
*І папера як немагчымасць.*

Пройдзе час, і менавіта гэтым чатырохрадкоўем Алесь адкрые свой чарговы паэтычны зборнік «Скрыжалі душы». «Раздвоенасць» альбо «Раздвоенасць душы» – так планаваў А. Паплаўскі назваць трэцюю кнігу паэзіі.

*Задоўжаны да вечнасці вяяж*
*У пошуках пустой, наіўнай мэты...*
*І страх несумяшчальнасці двух «Я»:*
*Расчуленага хціўца і паэта.*
(Прыгрэецца пакорлівасць-змяя)

Вершы, якія ўключыў паэт у трэці зборнік, у большасці выпадкаў пазбаўлены роспачнасці, у іх пануе мудрае разуменне дыялектыкі жыцця. Яны абуджаюць «творчую энергію людзей, перш за ўсё мысліцельную» (менавіта так разумела Н. Мацяш прадмет і сэнс любога віду мастацтва) [2, с. 51]. Гэтыя адметнасці новага зборніка выразна адчулі выдавец, які прымусіў А. Паплаўскага змяніць назву паэтычнай кнігі, А. Каско, які напісаў прадмову да зборніка і назваў «Спаталіцца неспакоем».

Скрыжалі душы А. Паплаўскага – мудрыя парады мастака слова сучаснікам і наступнікам, у якіх філасофія жыцця, асэнсаванне сябе як

творцы ў неспазнаным, шматаблічным свеце, у іх шлях да спазнання чалавека..: *«Няўцешнасць – за грэх адплата»; «Бязмежнасць – яшчэ не воля»; «Чужы пакой – не спавядальня»; «Мы сыходзім, каб памятаць... / І вяртаемся, каб застацца»; «Туга – не лекар. Страх – не абаронца»; «Страта ёсць небыццё, бо час, / Час – стваральнік і Час – прарок»; «Дзе радасць – там поруч здрада. / Дзе ўпэўненасць – там ваганні»...* Як бачна, сродкамі паратунку для паэта заўжды былі Творчасць, Бацькаўшчына, Айчына, Краса мастацтва, Каханне, Добрыя людзі...

Жыццёвыя сцежкі А. Паплаўскага бяруць свой пачатак на Кобрыншчыне (вёска Мазуры). Сустрэчы з цікавымі людзьмі, чытанне кніг абагацілі яго духоўна. Гады, праведзеныя ў Полацку (закончыў Полацкі лесатэхнікум), Віленскі перыяд жыцця (пасля заканчэння тэхнікума працаваў у рабочым пасёлку Котлаўка, што ў 30-ці кіламетрах ад Вільні) спрыялі творчаму сталенню будучага пісьменніка. Пасля заканчэння тэхналагічнага інстытута ў Мінску працаваў у лясгасах Гарадзеншчыны і Берасцейшчыны, у Берасцейскім зелянгасе, начальнікам адміністрацыйна-тэхнічнай інспекцыі ў гарвыканкаме, сёння – інжынер па забеспячэнні прадпрыемства «Аварыйна-аднаўленчых работ».

Сваіх аднадумцаў Алесь знайшоў у літаратурным аб'яднанні пры газеце «Зара», якім кіравала Зінаіда Дудзюк. З павагаю і любоўю гаворыць заўжды Алесь пра гэтую жанчыну, пісьменніцу, бо менавіта Зінаіда Іосіфаўна дапамагла сцвердзіцца маладому правінцыйнаму чалавеку. Яна пазнаёміла Алеся з Уладзімірам Калеснікам. З лёгкай рукі З. Дудзюк сталі з'яўляцца вершы пачаткоўца на старонках абласных газет. У 1990 годзе А. Паплаўскі – удзельнік Рэспубліканскага семінара маладых літаратараў у Іслачы. З гэтага часу ён піша толькі па-беларуску, свядома, зацікаўлена вывучае родную літаратуру: творчасць К. Чорнага, М. Танка, В. Быкава, У. Арлова і інш.

Пэўны перыяд часу Алеся на Берасцейшчыне болей ведалі як аўтара і выканаўцу бардаўскай песні. У канцы васьмідзясятых свет рамантычнаму маладому чалавеку, які пасяліўся на сталае жыццё ў Берасці, здаваўся цесным, няўтульным. І тады настойліва пачаў шукаць Алесь аднадумцаў. Ён узяў у рукі гітару. Для яго – гэта быў сродак зносін з людзьмі. Песенны дар А. Паплаўскі атрымаў у спадчыну ад бацькі, вясковага гарманіста, і маці, якая любіла спяваць і цудоўна выконвала народныя песні, а замежная літаратура, вывучэннем якой ён быў захоплены пэўны перыяд, узбагаціла напеўны, нязмушаны верш паэта, паглыбіла талент шчырага, пранікнёнага лірыка. Прынцып Верлена – «Музыка – перш за ўсё» – выразна прасочваецца ва ўсіх паэтычных кнігах А. Паплаўскага. Вершы паэта вызначаюцца элегічным пачаткам, сцішанасцю гукаў, тонкім лірызмам. Жывільнай музыкай тугі кранае амаль кожны паэтычны радок мастака слова. Па перакананні творцы, напачатку быў гук, а потым слова; словам можна

прынізіць, абразіць, а музыкай нельга. Музыка дапамагае мастаку слова будаваць сказы, падбіраць словы. Апошнім часам Алесь захапіўся класічнай музыкай, якая нязмушана гучыць на старонках кнігі паэзіі «Скрыжалі душы». Прыгажосць музыкі абвастрае не толькі ўнутраны слых і зрок паэта, але і чытача, дапамагае спасцігнуць гармонію скрозь тугу дысанансаў:

*Важкі крок і зацягнецца вузел*
*Неспатоленай сцежкі-душы.*
(Развітальнай, пякельнаю вехай)

Як бачна, чытаць паэзію А. Паплаўскага цяжка, пранікаць у неардынарную творчасць паэта даволі складана, але карысна, бо кожны чытач будзе мець магчымасць духоўна наталіцца.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. *Борсук, Н.* «Веру я – значыць я жыву!..» / Н. Борсук. – Заря. – 1997. – 3 жніўня.
2. *Мацяш, Н.* Мая сястра Эльке Эрб / Н. Мацяш. – Крыніца. – 1995. – № 7. – С. 48–53.
3. *Паплаўскі, А.* Пастка для рэха: аповесці / А. Паплаўскі – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2009. – 224 с.
4. *Хатэнка, А.* Па прыступках лесвіцы вечнай. Восень у прыродзе і чалавечым лёсе / А. Хатэнка. – Роднае слова. – 1993. – №8. – С. 66–73.